

# Веды на карысць сяброўства

**У верасні 2016 года Інстытут Канфуцыя ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце адзначае свой першы пяцігадовы юбілей**

Напэўна, наўрад ці каго сення здзіўляе жывая цікавасць беларусаў да Паднябеснай і іх жаданне вывучаць кітайскую мову. Сапраўды, вывучэнне кітайскай мовы пашырае культурна-адукацыйныя далягляды нашых грамадзян, спрыяе іх самасцвярджэнню, кар'ернаму росту. Да таго ж гэта прэстыжна: кітайская мова — адна з шасці афіцыйных моў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі абяцае стаць другой пасля англійскай па папулярнасці. Па статыстыцы, кожны пяты чалавек у свеце гаворыць па-кітайску. А яшчэ, сцвярджаюць знаткі, якія спасцігаюць мастацтва ператварэння рысачак у іерогліфы, кітайская мова зачароўвае і захапляе.

Ці так гэта? З гэтага пытання мы і пачалі нашу гутарку з дырэктарам Інстытута Канфуцыя ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, дырэктарам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МДЛУ, кандыдатам педагагічных навук Ларысай Трыгубавай, якой, дарэчы, у снежні 2015 года ўручылі ўзнагароду Ханьбань Individual Performance Excellence Award як прызнанне яе вялікага асабістага ўкладу ў развіццё Інстытута Канфуцыя.

***— Ларыса, вы маеце зносіны з тымі, хто вывучае ў Інстытуце Канфуцыя кітайскую мову? Што пра іх скажаце?***

— Паважаю тых людзей, хто не толькі праяўляе цікавасць да кітайскай мовы, але і актыўна бярэцца за яе вывучэнне. Кітайскай мовай з яе іерагліфічнай сістэмай паспяхова авалодваюць тыя, хто ўмее і любіць вучыцца, высока матываваныя і зацікаўленыя ў хутчэйшым выкарыстанні мовы на практыцы. Акрамя таго, захопленасць кітайскай мовай заахвочвае слухачоў Інстытута Канфуцыя глыбей вывучаць і лепш разумець унікальную культуру Кітая. І часта менавіта цікавасць да яе прыводзіць слухачоў на курсы кітайскай мовы. Я вельмі рада бачыць згуртаванасць слухачоў на занятках, калі яны, часта рознага ўзросту, у адной групе дружна асвойваюць кітайскія тоны, пішуць іерогліфы, спяваюць песні. У канцы кожнага навучальнага года ўсе групы Інстытута Канфуцыя дэманструюць свае дасягненні і таленты на выніковым канцэрце, выклікаю-

чы захапленне сваіх родных, сяброў і проста гледачоў.

***— Як у вас з'явілася цікавасць да Кітая?***

— Калі ў верасні 2011 года стваравўся Інстытут Канфуцыя ў нашым універсітэце, мяне спачатку ўвялі ў склад Праўлення як дырэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, а праз месяц усклалі абавязкі дырэктара Інстытута Канфуцыя. Так мне была прадстаўлена магчымасць і неабходнасць вывучыць і зразумець Кітай, каб пасля займацца распаўсюджваннем кітайскай мовы і культуры ў Мінску і Беларусі.

***— Як стварaўся Інстытут Канфуцыя ў МДЛУ?***

— Інстытуты Канфуцыя — сетка міжнародных культурна-адукацыйных цэнтраў, ствараемых Дзяржаўнай канцылярыяй па распаўсюджванні кітайскай мовы за мяжой (Ханьбань) у вядучых навучальных установах свету. Першы Інстытут Канфуцыя быў створаны ў 2004 годзе, а цяпер іх у свеце больш за 500.

***— Відаць, рашэнне Ханьбань аб адкрыцці Інстытута Канфуцыя ў вашым універсітэце — гэта прызнанне дасягненняў МДЛУ ў галіне выкладання замежных моў і, у прыватнасці, кітайскай мовы?***

— Так, але не толькі. Гэта таксама вялікі давер. Кітайскай ВНУ — партнёрам па развіцці Інстытута Канфуцыя ў МДЛУ стаў Паўднёва-Усходні універсітэт у горадзе Нанкін, адзін з буйнейшых універсітэтаў КНР.

18 верасня 2011 года пры ўдзеле старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў, члена Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК КПК У Банга, кіраўніцтва Ханьбань, пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь, Міністэрства адукацыі Беларусі адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця Інстытута Канфуцыя ў нашым універсітэце.

***— Даволі хутка Інстытут Канфуцыя быў прызнаны як адзін з лепшых у свеце. Чаму, як лічыце?***

— МДЛУ — вядучая лінгвістычная ВНУ краіны, і стварэнне Інстытута Канфуцыя на яе базе — гэта магчымасць спрыяць развіццю школы выкладання кітайскай мовы ў Беларусі, а таксама прапанаваць жыхарам Мінска, вучням школ, гімназій і ВНУ новыя

***У 2013 годзе Інстытут Канфуцыя ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце атрымаў званне "Лепшы Інстытут Канфуцыя года"***

якасныя адукацыйныя праграмы па кітайскай мове. А яшчэ Інстытут Канфуцыя ўстанаўлівае вялікую колькасць прафесійных кантактаў на розных узроўнях, і гэта, зразумела, развівае і паглыбляе дружалюбныя ўзаемаадносіны паміж Беларуссю і КНР.

У 2013 годзе наш Інстытут Канфуцыя атрымаў званне "Лепшы Інстытут Канфуцыя года" нараўне яшчэ з 27 Інстытутамі Канфуцыя ў свеце. Ужо з адкрыцця мы пачалі актыўна папулярызаваць і распаўсюджваць кітайскую мову і культуру. У лютым 2012 года ажыццявілі першы набор слухачоў на курсы кітайскай мовы, і з кожным годам колькасць жадаючых вывучаць кітайскую мову ў Інстытуце Канфуцыя ў МДЛУ няўхільна расла.

***— Што яшчэ робіце, каб прыцягнуць увагу да кітайскай культуры?***

— Мы ярка адзначаем кітайскія традыцыйныя святы з удзелам як слухачоў Інстытута Канфуцыя, так і студэнтаў МДЛУ, а таксама жыхароў горада Мінска. Арганізуем чайныя цырымоніі, фотавыставы і выставы мастацкіх работ, курсы аздараўленчай гімнастыкі тайцзіцюань, кітайскай кухні, праводзім майстар-класы па каліграфіі, традыцыйных кітайскіх мастацтвах выразання з паперы, пляцення вузлоў, а таксама вікторыны і конкурсы.

Поспехам карыстаюцца лекцыі запрошаных спецыялістаў з КНР па лінгвістыцы, літаратуры, выставы мастацкіх работ вядомых кітайскіх каліграфаў і мастакоў, канцэрты творчых фальклорных груп з КНР.

Інстытут Канфуцыя ў МДЛУ даўно стаў "сваім" у нашым універсітэце. Пры актыўнай падтрымцы рэктарата мы цесна супрацоўнічаем з усімі яго факультэтамі і падраздзяленнямі. Мне таксама прыемна адзначыць, што ў Інстытуце Канфуцыя дружна і згуртавана працуюць кітайскія выкладчыкі і беларускія супрацоўнікі, і ўсё гэта разам, напэўна, і вядзе нас да поспеху і прызнання. 15-хвілінны фільм пра Інстытут Канфуцыя, які мы стварылі ў 2014 годзе, так і назвалі — "На шляху да поспеху"

***— Раскажыце пра асноўныя напрамкі дзейнасці Інстытута Канфуцыя ў цяперашні час.***

— У першую чаргу Інстытут Канфуцыя арганізуе навучальныя курсы па кітайскай мове "Гутарковая кітайская мова" для розных катэгорый: школьнікі, студэнты, спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Папулярнасцю карыстаюцца курсы падрыхтоўкі да міжнародных экзаменаў па кітайскай мове HSK і HSKK. Больш за 800 чалавек вывучаюць кітайскую мову ў групах Інстытута Канфуцыя ў нашым універсітэце і яшчэ 10 навучальных установах гарадоў Мінска, Гродна, Магілёва, Маладзечна. Галоўнай перавагай курсаў Інстытута Канфуцыя ў МДЛУ з'яўляецца выкладанне кітайскай мовы носьбітамі мовы — выкладчыкамі з КНР, накіраванымі да нас Ханьбань, выкарыстанне навучальных рэсурсаў Ханьбань. 31 мая 2016 года мы ўрачыста адкрылі Клас Канфуцыя як філіял нашага Ін-



Здымак на памяць пасля выніковага канцэрта слухачоў ІК з удзелам творчай групы з правінцыі Цзянсу

стытута Канфуцыя ў гімназіі №1 імя Я.Ф.Карскага г. Гродна, у лістападзе плануем адкрыць Клас Канфуцыя у гімназіі №3 г. Магілёва. З верасня 2016 года выкладанне кітайскай мовы пачнём у гімназіі №1 г. Валожына. Як бачыце, Інстытут Канфуцыя спрыяе узмацненню пазіцыі кітайскай мовы у сістэме адукацыі у Беларусі.

Інстытут Канфуцыя ў МДЛУ пастаянна клапоціцца пра метадычную падрыхтоўку як кітайскіх выкладчыкаў-валанцёраў, так і выкладчыкаў кітайскай мовы беларускіх ВНУ, школ і гімназій: праводзяцца кансультацыі, круглыя сталы, тэматычныя семінары, лінгваметадычныя практыкумы.

У лютым 2015 года пры актыўнай падтрымцы Старшыні Праўлення Інстытута Канфуцыя, рэктара МДЛУ Н.П Баранавай у Студэнцкай вёсцы г. Мінска у інтэрнаце МДЛУ на праспекце Дзяржынскага, 97 быў адкрыты Цэнтр кітайскай мовы і культуры, дзе у спецыяльна абсталяваных пакоях "Вялікая кітайская сцяна", "Панда" і "Бамбук" бясплатна праводзяцца культурныя мерапрыемствы для усіх, хто цікавіцца кітайскімі народнымі традыцыямі і святамі, рознымі аспектамі развіцця сучаснага Кітая, у тым ліку музыкай, маладзёжнай модай, кіно і літаратурай.

Двойчы у год Інстытут Канфуцыя арганізуе міжнародныя экзамены па кітайскай мове HSK і HSKK, у якіх з 2012 па 2016 гады прыняло удзел каля 1300 чалавек. Сертыфікаты міжнародных экзаменаў па кітайскай мове даюць магчымасць удзельнічаць у конкурсе на атрыманне стыпендый Ханьбань для навучання у кітайскіх ВНУ на працягу семестра або года. За пяць гадоў дзейнасці па стыпендыях Галоўнага упраўлення Інстытутаў Канфуцыя Ханьбань у кітайскія універсітэты накіравана больш за 130 студэнтаў універсітэта.

Пачынаючы з 2012 года 100 слухачам Інстытута Канфуцыя была прадстаўлена магчымасць прыняць удзел у двухтыднёвым летнім лагеры Паўднёва-Усходняга універсітэта г. Нанкін, нашай кітайскай ВНУ — партнёра для вывучэння мовы і знаёмства з кітайскай культурай.

***— Прафесійныя кантакты, якія усталёўваюцца падчас візітаў спецыялістаў з КНР, арганізаваных Інстытутам Канфуцыя, даюць развіццё перспектыўнаму супрацоўніцтву беларускіх і кітайскіх спецыялістаў у розных сферах, у тым ліку і у медыцыне. Чым, па-вашаму, быў цікавы нядаўна арганізаваны Вамі у Мінску беларуска-кітайскі медыцынскі форум?***

— Яго наведала каля ста сямідзесяці беларускіх спецыялістаў па традыцыйнай кітайскай медыцыне, эндакрыналогіі і анкалогіі, якія змаглі не толькі узбагаціць і паглыбіць свае веды, пазнаёміўшыся з напрацоўкамі спецыялістаў бальніцы Чжунда Паўднёва-Усходняга універсітэта горада Нанкін, але і ацаніць свой прафесійны узровень. Форум мы арганізоўвалі сумесна з камітэтам па ахове здароўя Мінгарвыканкама і 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцай.

***— Як вы думаеце, чым Кітаю цікавая Беларусь?***

— На днях гэтае пытанне я задавала майму калегу, дырэктару Інстытута Канфуцыя з кітайскага боку Сюй Кэці, прафесару Паўднёва-Усходняга універсітэта у Нанкіне. І вось што ён адказаў: "Як сказаў Канфуцый, прыемна прымаць сяброў здалёку. Хоць Беларусь і Кітай геаграфічна далёкія адзін ад аднаго, у нашых краін шмат агульнага у філасофіі, стаўленні да жыцця і узаемаадносінаў людзей. Гэта, магчыма, тлумачыць цесныя стратэгічныя і палітычныя стасункі паміж краінамі.

Кітай праяўляе цікавасць да Беларусі як мінімум па дзвюх прычынах. З аднаго боку, Беларусь — вельмі прыгожая краіна з цудоўнымі лясамі і дагледжанай прыродай. Кітайцы пачынаюць часцей прыязджаць у Беларусь, каб атрымліваць асалоду ад яе прыгажосці. Акрамя таго, беларусы вельмі ветлівыя і гасцінныя. З імі прыемна мець зносіны і ў іх ёсць чаму павучыцца. У Беларусі добра развітая навука, мастацтва, літаратура, што прыцягвае кітайскіх студэнтаў вучыцца тут. Па-другое, абедзве нашы краіны цесна супрацоўнічаюць на міжнароднай арэне. Цяпер Кітай ажыццяўляе праект "Адзін пояс, адзін шлях", і Беларусь стала важным стратэгічным партнёрам у яго рэалізацыі. Развіццё Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка "Вялікі камень" дае абедзвюм краінам перавагі ад такога супрацоўніцтва.

***— Як збіраецеся святкаваць пяцігадовы юбілей Інстытута Канфуцыя?***

— Мы плануем цэлую серыю мерапрыемстваў: урачысты вечар ва універсітэце з удзелам прадстаўнікоў устаноў адукацыі, дзе працуюць выкладчыкі Інстытута Канфуцыя, майстар-класы па тайцзі і каліграфіі, фотавыставы, выставы кніг, конкурсы, тэматычныя круглыя сталы і творчыя майстэрні, выступленні у сродках масавай інфармацыі.

***— Дазвольце павіншаваць усіх, хто мае непасрэднае дачыненне да дзейнасці Інстытута Канфуцыя і Вас асабіста з надыходзячым юбілеем і пажадаць новых дасягненняў на шляху спасціжэння вялікай кітайскай культуры.***

Гутарыла Валянціна **Ждановіч**